Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
______________Ю. П. Бондар
«____»____________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___ /вуч.

# МЕТАДЫ КАНТЭКСТУАЛЬНАГА АНАЛІЗУ МАСТАЦКАГА ТВОРА

*Вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. М. Шаройка,* дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Н. У. Карчэўская,* дацэнт кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства;

*Я. У. Голікава-Пошка*, старшы навуковы супрацоўнік аддзела экранных мастацтваў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 14 ад 20.05.2015);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 18.06.2015)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск: *А. М. Шаройка*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Метады кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь адпаведна патрабаванням адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках).

Вучэбная дысцыпліна «Метады кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора» завяршае спасціжэнне методыкі аналізу твораў мастацтва, неабходнай пры вывучэнні беларускага і сусветнага мастацтва ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці. Яна прадстаўляе сабой акумулятыўную выніковую дысцыпліну, якая базіруецца на міждысцыплінарным падыходзе інтэгратыўнага мастацтвазнаўства.

Вучэбная дысцыпліна «Метады кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора» цесна ўзаемазвязана з другімі дысцыплінамі прафесійнага цыкла – «Аналіз твораў мастацтва», «Мастацтва ХХ ст.», «Псіхааналіз мастацтва» і г.д.

Засваенне адукацыйнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Метады кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора» павінна забяспечыць фарміраванне наступных *акадэмічных кампетэнцый:*

АК-2. Валодаць культурай мышлення.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем.

АК-10. Рацыянальна арганізоўваць сваю працу, ацэньваць вынікі сваёй дзейнасці.

АК-11. Свабодна ўжываць прафесійную тэрміналогію.

АК-13. Валодаць інфармацыяй у сферы гістарычных ведаў, разумець рухаючыя сілы і заканамернасці гістарычнага працэсу для ўзбагачэння зместу сваёй даследчай, мастацка-творчай і педагагічнай дзейнасці.

АК-20. Валодаць асноўнымі метадамі абароны ад магчымых наступстваў аварый, катастроф, стыхійных бедстваў.

Таксама студэнт павінен набыць наступныя *сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі*:

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-7. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю.

САК-10. Адаптавацца да новых сітуацый сацыяльна-прафесійнай дзейнасці, рэалізоўваць назапашаны вопыт, свае магчымасці.

Пасля вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен валодаць наступнымі *прафесійнымі кампетэнцыямі* і быць здольным:

ПК-1. Кваліфікавана праводзіць навуковыя даследаванні па выяўленні, апісанні, аналізе, рэцэнзаванні твораў мастацтва.

ПК-2. Ведаць прынцыпы збору, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі для правядзення навуковых даследаванняў у канкрэтных галінах мастацтва.

ПК-3. Рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры і мастацтваў.

ПК-12. Прымаць удзел у правядзенні экспертызы твораў мастацтва, даваць кваліфікаваныя заключэнні і кансультацыі.

ПК-15. Планаваць і ўдасканальваць дзейнасць службаў кіравання ў сферы культуры і мастацтва, забяспечваць бяспечныя ўмовы працы.

ПК-21. Працаваць з літаратурнымі, дакументальнымі, іканаграфічнымі, архіўнымі матэрыяламі ў сферы сваёй прафесійнай дзейнасці.

ПК-23. Узаемадзейнічаць з арганізацыямі і спецыялістамі, уключанымі ў працэс стварэння мастацкага твора.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Метады кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора» – прадставіць на канцэптуальным узроўні стратэгіі кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора (музычнага, выяўленчага, тэатральнага, кінамастацтва). Набытыя падчас навучання веды павінны дазволіць студэнту дасведчана, пісьменна і прафесійна арыентавацца ў шэрагу агульных гістарычных і тэарэтычных пытанняў у галіне мастацтва.

*Задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

– аваloданне метадалогіяй даследавання мастацкага твора;

– вывучэнне марфалогіі мастацтва;

– засваенне стратэгій кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працэс падрыхтоўкі спецыялістаў накіраваны на авалоданне студэнтамі *ведамі і ўменнямі,* якія дазваляць на высокім узроўні вырашаць прафесійныя задачы ў далейшай творчай і педагагічнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– гісторыка-тэарэтычныя асновы мастацтва;

– спецыфіку вобразнасці мастацкага тэксту;

– асноўныя гістарычныя факты, падзеі, даты, імёны дзеячаў музычнага мастацтва;

– відавую і жанравую класіфікацыю розных відаў мастацтваў;

– стылі, напрамкі, плыні ў мастацтве;

– спецыфіку вобразнай мовы твораў розных відаў мастацтва, іх відавую і жанравую спецыфіку;

– галоўныя метадалагічныя падыходы да даследавання твора;

*умець:*

– выяўляць сутнасць мастацкага твора з дапамогай выкарыстання розных тэарэтычных прынцыпаў і метадаў;

– характарызаваць семіятычную і сімвалічную вобразнасць твораў мастацтва;

– самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць аўтара;

– вызначаць спецыфіку вобразнай мовы твораў мастацтва;

– аналізаваць творы мастацтва з пазіцый розных метадалагічных стратэгій;

*валодаць:*

– марфалогіяй мастацтва;

– метадалагічнымі стратэгіямі кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора.

Выкладанне дысцыпліны «Метады кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора» мэтазгодна ажыццяўляць у форме лекцыйных, семінарскіх і практычных заняткаў. Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, якія адказваюць мэтам вывучэння дадзенай дысцыпліны, з’яўляюцца праблемнае навучанне (даследчы метад) і камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, праблемныя дэбаты, круглы стол і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заняткі суправаджаюцца аўдыявізуальнымі і мультымедыйнымі дэманстрацыямі, слайд-прэзентацыямі для ўзмацнення эмацыянальна-вобразнага ўспрымання матэрыялу курса.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Метады кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора» ўсяго прадугледжана 68 гадзін, з якіх 48 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 16 гадзін, семінарскія – 32 гадзіны. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінар. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | - |
| *Тэма 1.* Марфалогія мастацтва | 16 | 6 | 10 |
| *Тэма 2.* Метадалагічныя стратэгіі кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора | 30 | 8 | 22 |
| **Разам…** | **48** | **16** | **32** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Аналіз твора як мастацтвазнаўчая праблема. Спецыфічныя рысы твораў розных відаў мастацтва. Аўтарская ідэя і шляхі яе спасціжэння. Варыятыўнасць стратэгій аналізу мастацкага твора.

### *Тэма 1. Марфалогія мастацтва*

Праблемы вызначэння дэфініцыі «мастацкі твор». Мастацкі твор, артэфакт, тэкст. Мастацкі твор як структура. Тэмпаральны строй мастацкага твора. Вобразная мова мастацкага твора. Іерархія выразных сродкаў. Тропы (метафара, іронія, парафраза і інш.). Сінтаксічныя фігуры (рэфрэн, кантрапункт, інверсія). Рытм і тэмпарытм. Стыль і стылістыка.

Двуадзінства зместу і формы. Тэматыка і праблематыка. Канфлікт. Кампазіцыя як структура і як працэс. Паўтор, супрацьпастаўленне, кантамінацыя як прынцыпы мастацкай пабудовы.

### *Тэма 2. Метадалагічныя стратэгіі кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора*

Паняцці «кантэкст» і «кантэкстуальнае атачэнне» мастацкага твора. Традыцыйны (гістарыяграфічны) падыход да кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора (кантэкстуальнае асяроддзе ўзнікнення мастацкага твора): сацыяльна-гістарычны кантэкст; мастацкі кантэкст; біяграфічны кантэкст.

Апрабацыя на прыкладзе жывапіснага палатна «Начны дазор» Рэмбрандта, оперы «Чароўная флейта» В. А. Моцарта, фільма «Іван Жахлівы» С. Эйзенштэйна.

Навейшы (інтэрпрэтацыйны) падыход да кантэкстуальнага аналізу мастацкага твора (аналіз мастацкага твора ў кантэксце пэўнай навуковай тэорыі): сацыяльнай; псіхааналітычнай; гендарнай.

Метад кантэкстуальнага аналізу на другім узроўні ўключае:

– выяўленне спецыфікі вобразнай канструкцыі мастацкага твора (прапорцыя рэальнага ды ірэальнага; характэрныя знакава-вобразныя фігуры);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вызначэнне дактрыны, у кантэксце якой мяркуецца разглядаць твор, і яе базавых катэгорый;

– дэшыфроўку сімволікі вобразнага строю на падставе канцэптуальных высноў абранай дактрыны.

Апрабацыя на прыкладзе жывапісных палотнаў «Тэрор» Д. Дзеркавіча і «Партызанская мадонна (Мінская)» М. Савіцкага, балетаў «Жызэль» і «Спячая прыгажуня» ў пастаноўцы М. Эка, фільмаў «Хірасіма, мая любоў» А. Рэнэ і «Канфарміст» Б. Берталучы.

На абодвух узроўнях пры кантэкстуальным аналізе кожнага асобнага мастацкага твора звышзадачай з'яўляецца сінтэз трох адпаведных падпунктаў.

Псіхааналіз і мастацтва. Уплыў тэорыі З. Фрэйда на творчасць мастакоў, рэжысёраў, пісьменнікаў XX ст. Паняцце «архетып» па К. Юнгу. Канцэпцыя А. Менегецці. Падсвядомае аўтара і падсвядомае персанажа.

Методыка аналізу літаратурнага, сцэнічнага і экраннага твораў у кантэксце псіхааналітычнай тэорыі (па Н. А. Агафонавай):

– пабудова сюжэтнай карты твора;

– «анамнез душы» (М. Капрэлава) пратаганіста з пункту гледжання феномена «выціснутага» (З. Фрэйд);

– выяўленне «патаемных» матываў і сапраўднай завязкі і сутнасці канфлікту.

Аналіз класічнага фільма ў кантэксце псіхааналітычнай тэорыі: «Огр» Ф. Шлёндарф, «Начны парц'е» Л. Кавані, «Сунічная паляна» І. Бергмана.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Агафонова, Н. А.* Общая теория кино и основы анализа фильма / Н. А. Агафонова. – Минск : Тесей, 2008. – 392 с.

2. Би-текстуальность и кинематограф / ред., сост. и авт. вступ. ст. А. Усманова. – Минск : Пропилеи, 2003. – 186 с.

3. *Есин, А. Б.* Принципы и приемы анализа литературного произведения : учеб. пособие / А. Б. Есин. – 7-е изд., перераб. – М. : Флинта, 2005. – 248 с.

4. *Менегетти, А.* Кино, театр, бессознательное / А. Менегетти. – М. : Онтопсихология, 2001. – Т. 1. – 384 с.

5. *Метц, К.* Кино, фотография, фетиш / К. Метц // Киновед. зап. – 1994. – № 23. – С. 52–64.

6. *Митри, Ж.* Визуальные структуры и семиология фильма / Ж. Митри // Строение фильма : некоторые проблемы анализа произведений экрана : сб. ст. / сост. К. Э. Разлогов. – М. : Радуга, 1984. – С. 33–44.

7. *Платаниа, Д.* Юнг для начинающих / Д. Платаниа ; пер. с англ. В. Ф. Круглянского. – Минск : Попурри, 1998. – 160 с.

8. *Фрейд, З.* Я и Оно / З. Фрейд // Психология бессознательного : сб. произведений / сост., науч. ред., авт. вступ. ст. М. Г. Ярошевский. – М. : Просвещение, 1990. – С. 425–439.

9. *Фрейд, З.* О сновидении / З. Фрейд // Психология бессознательного : сб. произведений / сост., науч. ред., авт. вступ. ст. М. Г. Ярошевский. – М. : Просвещение, 1990. – С. 310–343.

10. *Фромм, Э.* Бегство от свободы / Э. Фромм. – Минск : Попурри, 2000. – С. 5–366.

*Дадатковая*

1. *Рикер, П.* Конфликт интерпретаций / П. Рикер. – М. : Медиум, 1995. – 415 с.

2. *Руднев, В. П.* Словарь культуры XX в. / В. П. Руднев. – М. : Аграф, 1997. – 384 с.

3. *Юнг, К.* Психологические типы / К. Юнг ; пер. с нем. С. Лорие ; под общ. ред. В. В. Зеленского. – Минск : Попурри, 1998. – 656 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4. Юнг, К. Г.* Об отношении аналитической психологии к поэзии : пер. с англ. / К. Г. Юнг // Психоанализ и искусство / К. Г. Юнг, Э. Нойманн. – М., 1996. – С. 9–29. – (Сер. «Актуальная психология»).

*5. Юнг, К. Г.* Воспоминания, сновидения, размышления / К. Г. Юнг ; пер. с нем. И. Булкиной. – К. : Citadelle, 1994. – 405 с.

*6. Юнг, К. Г.* Душа и миф : шесть архетипов / К. Г. Юнг ; пер. с англ. В. В. Наукманова. – Киев : Гос. б-ка Украины для юношества, 1996. – 384 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для ажыццяўлення кантралюемай самастойнай работы студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць дыягнастычны інструментарый, які мае дыдактычны характар і ўжываецца комплексна. У якасці аднаго са сродкаў кантролю і ацэнкі могуць быць выкарыстаны крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным або некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух мностваў з адным або некалькімі суадносінамі і аднолькавай або рознай колькасцю элементаў у мноствах; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці, якія мяркуюць фармалізаваны адказ.

Для вымярэння ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендуецца выкарыстоўваць заданні адкрытай формы са свабодна канструяваным адказам, праблемныя і творчыя задачы, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

Кафедры УВА маюць права вызначаць віды і перыядычнасць ажыццяўлення кантрольна-ацэначнай дзейнасці з улікам структуры зместу вучэбнай дысцыпліны.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Мэтай самастойнай працы студэнтаў з'яўляецца стымуляванне пазнавальнай актыўнасці, пераход на прадуктыўны, творчы ўзровень засваення ведаў у развіцці акадэмічных, сацыяльна-асобасных, прафесійных кампетэнцый.

Самастойная праца студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з палажэннем аб самастойнай працы студэнтаў і ажыццяўляецца ў выглядзе аўдыторных і пазааўдыторных форм. Па дысцыпліне распрацоўваецца вучэбна-метадычны комплекс з матэрыяламі і рэкамендацыямі, якія дапамогуць студэнту ў арганізацыі самастойнай работы. Для ацэнкі якасці самастойнай работы студэнтаў ажыццяўляецца кантроль за яе выкананнем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Найбольш якаснаму працэсу навучання студэнтаў па названай дысцыпліне павінны садзейнічаць дадатковы прагляд і аналіз твораў мастацтва.

Самастойная работа студэнтаў уключае ў сябе напісанне рэфератаў па вывучаемых тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МЕТАДЫ КАНТЭКСТУАЛЬНАГА АНАЛІЗУ МАСТАЦКАГА ТВОРА**

*Вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60х84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,82. Ул.-выд. арк. 0,37. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ